***Метадычная распрацоўка мае на мэце дапамагчы настаўнікам беларускай мовы і літаратуры пры правядзенні мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня беларускага пісьменства, прадметных тыдняў, займальных перапынкаў, зацікавіць вучняў жыццём і творчасцю беларускіх пісьменнікаў і беларускай літаратурай наогул.***

# Хвілінкі з беларускімі пісьменнікамі

### І звычайнае натхняе...

Прапанаваны прадметы. Напішыце, каго з беларускіх пісьменнікаў яны асабліва натхнілі.

| | |
|---|---|
| купальскі вянок | |
| колас | |
| васілёк (валошка) | |
| шыпшына | |
| дудка | |
| крапіва | |
| лучына | |

**Адказ:** купальскі вянок — Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч), колас — Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), васілёк — Максім Багдановіч, шыпшына — Уладзімір Дубоўка, дудка — Францішак Багушэвіч, крапіва — Кандрат Крапіва, лучына — Янка Лучына (Іван Люцыянавіч Неслухоўскі). **Заўвага.** Вучні маюць права выказваць і іншыя меркаванні: напрыклад, колас — Уладзімір Караткевіч (маецца на ўвазе раман "Каласы пад сярпом тваім").

### Лічбы шмат пра што гавораць

Пастаўце лічбы ў такім парадку, каб атрымалася дата нараджэння (спачатку дзень, затым — месяц, год) таго ці іншага пісьменніка ці паэта. Укажыце, каго.

| Дата нараджэння | Пісьменнік | |
|---|---|---|
| 99161420 | | |
| 11190982 | | |
| 01223459 | | |
| 93300156 | | |
| 19120064 | | |

**Адказ:** 19.06.1924 — Васіль Быкаў; 09.12.1891 — Максім Багдановіч; 24.02.1935 — Рыгор Барадулін; 03.06.1935 — Васіль Зуёнак; 06.02.1914 — Аркадзь Куляшоў.

### Слова мудрае возьмем у жыццё

Паразважайце, чаму вучаць выказванні. Скажыце, каму яны належаць.

| Выказванне | Аўтар |
|---|---|
| Наведвайце бацькоў, пакуль яны жывыя... | |
| Жыццё даецца, каб жыццё тварыць | |
| Гора будзе ўсім тым, хто не трымаўся кніжнай мудрасці... | |
| На нягоды жыцця не жальцеся... | |
| Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова... | |
| Чалавек — гэта цэлы свет | |
| Без кахання шчасця, долі няма на зямлі | |

**Адказ:** "Наведвайце бацькоў, пакуль яны жывыя..." (Рыгор Барадулін). "Жыццё даецца, каб жыццё тварыць" (Анатоль Вярцінскі). "Гора будзе ўсім тым, хто не трымаўся кніжнай мудрасці..." (Кірыла Тураўскі). "На нягоды жыцця не жальцеся..." (Пімен Панчанка). "Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова..." (Францыск Скарына). "Чалавек — гэта цэлы свет" (Кузьма Чорны). "Без кахання шчасця, долі няма на зямлі" (Янка Купала).

### Іх родная зямля ўзгадавала

Назавіце населеныя пункты, аб якіх вядзецца размова.

1. Засценак, у якім нарадзіўся класік беларускай літаратуры Якуб Колас. Гэты населены пункт з'яўляецца ўскраінай Стоўбцаў. Сёння для наведвальнікаў адкрыты музей.

2. У гэтым горадзе на поўначы Беларусі расце шмат каштанаў. Калі гавораць пра гэты населены пункт, згадваюць і славуты льнокамбінат, і легендарнага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча.

3. Назва гэтага населенага пункта сугучна з назвай сусветнай рэлігіі. Тут нарадзіўся гуманіст, асветнік, філосаф, перакладчык Сымон Будны.

4. Гэты старажытны беларускі горад немагчыма ўявіць без знакамітай Прадславы (Ефрасінні), якая стала святой, нябеснай заступніцай Беларусі.

5. Частка гэтага слова гучыць як распаўсюджанае беларускае імя Янка. Вёска, у якой нарадзіўся Генрых Далідовіч, размешчана ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці.

**Адказ:** 1. Акінчыцы. 2. Орша. 3. Буды. 4. Полацк. 5. Янкавічы.

### І слова трапнае песціць слых

Растлумачце, што абазначаюць выдзеленыя словы ў прапанаваных тэкстах.

1. Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою ***спачываю*** (Якуб Колас).

2. Помніць свой на іржышчы цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом ***бяседа*** (Рыгор Бярадулін).

3. Той дзень, лічы, завянуў ***пустацветам,***
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць куточак свету
І хараство людзей, і дрэў, і траў (Пімен Панчанка).

**Адказ:** 1. Спачываць (тут) — магчымасць мець адпачынак. 2. Бяседа — збор гасцей з пачастункам, а таксама ўдзельнікі такога збору (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы). 3. Пустацвет (тут) — нешта зробленае надарэмна.

### І думка майстра ажыве

Прыгадайце аўтараў і творы па апісанні. Можна выкарыстоўваць падказкі ў выглядзе QR-кодаў.

1. Некаторыя сцэны адбываюцца каля калодзежа. Калодзеж — не проста фон і месца дзеяння, а вобраз-сімвал.

2. Гаснуць вячэрнія агні. Гераіня твора катаецца на каньках, прыгожа, натхнёна, паэтычна.

3. Міфічная істота з сівымі вусамі. У яго "твар травой аблытаны".

4. Каля вішнёвых кветак лётае "шпаркі, лёгкі" матылёк. Яго "песняй" захапляецца наваколле.

5. Паміж беларускіх балот, на беразе ракі стаіць курган як увасабленне мінулых часоў.

**Адказ:** 1. Аляксей Дудараў "Вечар". 2. Мікола Лупсякоў "Мэры Кэт". 3. Максім Багдановіч "Вадзянік". 4. Максім Багдановіч "Маёвая песня". 5. Янка Купала "Курган".

**Таццяна МОЙСА,**
**метадыст Дзяржынскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета Мінскай вобласці.**